# САВЯНЯТКА

**Лена Маер-Скуманц / Сальваторэ Ш’яш’я**

**Лявон Баршчэўскі (Переклад)**



**Даўным-даўно, калі людзі й жывёлы яшчэ гаварылі адной і той самай моваю, за Летуценнымі гарамі жыла птушачка, маленькае Савянятка. Яно было самае меншае сярод усіх Савянятаў-брацікаў ды сястрычак і самаю апошняю пакінула гняздэчка – дупло ў старым дрэве. Бацькі-Совы навучылі яе лятаць, лавіць мышэй ды песьціцца на сонцы. І аднаго разу яны сказалі: -- Сьмялей, Савянятка! Ляці -- паглядзі на сьвет!**
**-- А ці ж я яшчэ не занадта малая на гэта? -- запыталася Савянятка. Бацькі-Совы шчоўкнулі дзюбамі й паблажліва пыхкнулі: -- Вялікая-Сава-Стваральніца-Ўсяго будзе тваёй абаронцай, пакуль ты будзеш падарожнічаць! А ўсе правілы ты добра ведаеш: забівай таго, каго выбераш сабе на корм, як мага хутчэй. Гэтак яно не пасьпее адчуць болю й будзе табе смачнейшае. Радуйся кожнаму сьвятлу, няхай яно будзе й зусім слабенькае. А што да палётаў на вялікія адлегласьці, дык слухай вось што: лятаць вучацца лятаючы, й да гэтага тут нічога не дадасі. Савянятка пачало круціць галавою ў розныя бакі, каб яшчэ раз як сьлед разгледзець сваіх бацькоў ды роднае дрэва. Яно запыхкала, завіскатала, завухкала, а пасьля распрастала крылцы ды паляцела прэч з роднага гняздэчка.**

**Лес за Летуценнымі гарамі быў вялікі й кішэў зьвярамі. Праляцеўшы зусім крыху, Савянятка ўбачыла на палянцы ўзгорак з камянёў. Савянятка села на парослы мохам востры камень, зірнула на нізкае сонца й моцна ўсьцешылася. Яно ўбачыла, што ніжэй, на яшчэ цёплым ад сонечных промняў камені ляжаў Лясны Кот. Чатыры чорныя палосы віднеліся ў яго на пысе, ад носа да йлба. Закручаны пушысты хвост Ляснога Ката зьлёгку пачаў кратацца, калі ён падняў голаў ды ўтаропіў свае маленькія вочкі на**

Савянятка. -- Гэй, Сава! Добра што ты сюды прыляцела. Ану скажы мне: як гэта Вялікі-Лясны-Кот-Стваральнік-Усяго дапусьціў, што ёсьць каты, якія дазваляюць сябе прыручыць? -- Пра што гэта ты? -- зусім спалохана завухкала савяня. -- Учора ўвечары я забег гэтак далёка, як яшчэ ніколі ў жыцьці не забягаў – аж да ручая, што бяжыць зь Летуценных гор. Там я ўбачыў чалавечую хаціну з камянёў ды дрэва, а каля яе гэтак смачна пахла свойскай птушкаю. Але я ня быў галодны й хацеў адно крыху паназіраць зводдаль. Перад хацінаю сядзеў чалавек: ён трымаў на каленях Ката ды гладзіў яго. Кот не бараніўся ані ікламі, ані лапамі, а толькі вуркатаў. У мяне ажно дрыжыкі па скуры пабеглі. Дазволіць да сябе дакранацца – бр-р-р! Як гэткае мажліва? Савянятка нахілілася долу, потым, крутнуўшы галавою, застракатала: -- Скуль жа мне гэта ведаць? Лясны Кот выпрастаў сьпіну, ягоны закручаны хвост уздыбіўся, зрабіўшыся яшчэ больш пушыстым. Ягоныя вочы заблішчалі жоўтым і зялёным колерамі.



-- І ты пра гэта пытаеш? -- пырхнуў кот. – Ты ж – Сава, а Совы ўсе мудрыя й ведаюць адказы на любое пытаньне сьвету! -- Я пра гэта ня ведала, -- спалохана прамармытала Савянятка. -- Дык навошта ты тады тут? -- пыхкнуў Лясны Кот. – Пасаромся й ляці адсюль!

Савянятка было гэтак агаломшана, што тут жа распрастала крылы й хуценька паляцела прэч. Яно знайшло дрэва з доўгім камлём ды шырокай каронаю лістоты, што зіхцела ў промнях позьняга сонца. Савянятка села на самай ніжняй галінцы й паспрабавала ўсё абдумаць.Тут раптам унізе нешта зашумела, затраскатала, залапатала цяжкімі крыламі, і вось, побач з Савяняткам на галінку села Пава. Пад ейнаю вагою галінка моцна нахілілася. -- Ну вось, яшчэ раз удалося! -- выгукнула запыхана Пава. – Штовечар, перад тым як ісьці спаць, даводзіцца зноў і зноў высільвацца! Чаму я ня ўмею гэтаксама добра лятаць, як бегаць? Гэй, хто гэта тут сядзіць?! -- Ты, малое, паслухай: гэта МАЁ дрэва, на якім я сплю! -- Прабачце, калі ласка! -- ціўкнула Савянятка. Пава патрэсла сваім прыгожым пер'ем, а потым сказала: -- О, гэта Сава, чуваць па голасе.

**Якраз добра. Распрастаўшы свой вялікі хвост, Пава зьвесіла яго старчаком да зямлі.**



**Потым яна сказала: -- У мяне ёсьць пытаньне, якое не дае мне спакою: чаму гэта Вялікая-Пава-Стваральніца-Ўсяго стварыла так мала дрэваў, на якіх маглі б спаць гэткія, як мы? -- Ах-ах, што, што? -- засапло Савянятка. -- Ну, ты ж бачыш, які ў мяне доўгі хвост, -- сказала Пава. – Я магу рабіць крыламі кола, Але калі я хачу спакойна ўлегчыся спаць, ён прычыняе мне гэтулькі клопату. Мне падыходзяць адно толькі дрэвы, у якіх высокія папярэчныя галінкі. Іх у гэтым лесе занадта мала! -- А хіба гэтае табе не падыходзіць? -- прашаптала Савянятка. -- Добра было б, каб я магла нешта выбраць з двух альбо трох, -- прамовіла Пава. – Але ты мне адкажы: чаму пра гэта не паклапаціліся? -- Я ня ведаю, -- адказала Савянятка. Пава нахіліла галаў, гэтак што ейная блакітная карона зь лістоты ледзьве не дакранулася да Савяняткі. -- Ты ня ведаеш? Чаму ж гэта ты ня ведаеш? Совы ж ведаюць адказы на ўсе пытаньні сьвету! -- Я таксама ня ведала, што гэта ёсьць пытаньне сьвету, -- прызналася Савянятка. -- Вось дурное малое, ты ж зусім ніякая не Сава! -- праквахтала Пава. -- Пасаромся й ляці адсюль! Спалоханае Савянятка паляцела прэч.**

**Яно знайшло скалу зь невялікай пячораю й залезла ў адтуліну, каб перадыхнуць ды ўсё абдумаць. -- Чаму я павінна саромецца? -- сказала яна сама сабе. – Чаму я паінна ведаць адказы на пытанні сьвету? Як гэта Лясны Кот можа гаварыць пра Ляснога-Ката-Стваральніка-Ўсяго, а Пава – пра Вялікую-Паву-Стваральніцу-Ўсяго, калі ўсё-ткі гэта была Вялікая-Сава-Стваральніца-Ўсяго?**

**Сонца ўжо зайшло за Летуценныя горы. На захадзе ў небе зіхцела вечаровая зорка, месяц ціха ўзыходзіў над вершалінамі дрэваў. Ягоныя промні патрапілі таксама ў пячору, й Савянятка ўзрадавалася срэбнаму сьвятлу.**

**-- Час вылятаць! -- прапішчаў голас ззаду за ім. – Што за файная ноч! зякуй Вялікаму-Кажану-Стваральніку-Ўсяго! Савянятка павярнула галаву й убачыла Кажана, які сядзеў на скальнай сьцяне, зьвесіўшы голаў і моцна ўцяўшыся кіпцямі задніх ды кіпцюрастымі пальцамі пярэдніх лапаў у камень. Пасьля ён пакрысе пачаў выпростваць свае крылы, каб пашмараваць іх тлушчам. Кажан зьбіраў языком масьлянкавую вадкасьць, што выдзялялася з адтулінаў па-над ягонымі ноздрамі, і хуценька наносіў яе на паверхню крылаў. -- Вой-вой-вой! Ну й сьмярдзіць жа! -- вырвалася ў Савяняткі.**



**-- Пахне моцна! -- пагадзіўся Кажан. – Таму на корм табе я не падыйду. Ты ж Сава, ці праўда? -- Сава, але ж яшчэ зусім маленькая й, мажліва, нават несапраўдная... -- Т-с-с-с. Сава яна й ёсьць Сава, а Совы ведаюць адказы на пытаньні сьвету, -- сказаў Кажан. – Вось у мяне ёсьць пытаньне, мая даражэнькая. Кажан зьвесіўся наперад, цераз край адтуліны, й быў цяпер перад самым Савяняткавым тварам. -- Зірні, -- прапішчэў ён, – які я дасканала збудаваны ды як цудоўна аснашчаны да ўсяго! Нават самай цёмнаю ноччу я здабываю сабе камароў на ежу. Я ўшчынаю крык, а калі вяртаецца рэха, падлятаю да іх ды хапаю. Толькі вось адно мяне засмучае: штогод у нас, Кажаноў, з'яўляецца адно-аднюткае дзіця. Матылькі ды Малі кладуць шмат-шмат яец, за Вожычыхай заўсёды цёпкае доўгая чарада Вожычанятаў, у Лісіцаў бывае не менш як па трое дзіцянятак. Чаму ж нам Стары-Кажан-Стваральнік-Усяго пасылае толькі па адным дзіцяці? -- Гэтага я ня ведаю, -- адказала Савянятка. Зьдзіўлены Кажан пачаў гойдацца сюды й туды. -- Ты гэтага ня ведаеш?! Хіба я магу ў гэта паверыць?! -- Гэтага я ня ведаю, -- паўтарыла Савянятка й вусьцішна застагнала ад засмучэньня. -- Калі ты гэтага ня ведаеш, дык хто тады ведае? -- журботна запытаўся Кажан. – Можа, ты проста як сьлед гэта не абдумала, га? Можа, ты зноў прыляціш сюды, калі будзеш ведаць адказ? Савянятка старанна заківала галавою. -- Добра, -- прапішчэў Кажан, распрастаў свае крылы й порстка паляцеў у цямрэчу. Ад яго імклівых**

**тонкіх крыкаў скаланалася паветра. Усьлед за ім з глыбіні пячоры вылецела яшчэ шмат іншых Кажаноў. Савянятка глядзела ім усьлед, бачачы ў месяцовым сьвятле мудрагелістыя траекторыі іх палётаў.**



**Хоць Савянятка й было надта засмучанае, яно ўсё-ткі адчувала сябе моцна згаладалым. Цэлую ноч яно займалася паляваньнем, нібы маланкаю налятаючы й забіваючы мышэй-палёвак. Савянятка наелася гэтак, што яму ўжо нічога ня лезла ў рот. І вось, пачуўшы, як пад зямлёю хуценька прабягае чарговая мышка, яно запыталася ў яе: -- Гэй ты, там унізе! Адкажы мне: што за магутная Істота стварыла й цябе, й мяне, й усё на гэтым сьвеце? Праз хвілю з норкі пачуўся пісклявы голас: -- Вялікая.Мыш – хто ж яшчэ? Гэта ж табе, усяведніку, добра вядома! Што за падступнае пытаньне? Ці ты проста хочаш выманіць мяне з маёй норкі? Вось гэткія, як вы, й вінаватыя ў тым, што нехта з нашых увесь час прападае. Ах, каб толькі я ведала, чаму вы, Совы, ня створаныя для таго, каб есьці траву!.. --...Альбо зерне, -- пыхнула Савянятка. -- Не, зерне належыць нам, -- пачуўся яшчэ цішэйшы піск, а потым і ён заціх.**

**Савянятка паляцела далей, шукаючы сабе на спачынак высокую вершаліну дрэва. -- Вух-вух-вух! Я ніякі не ўсяведнік, -- гуло яно. – ...Я проста нязнайка: гэта ўжо мне дакладна вядома. Унізе прашмыгнуў шэры цень з тоўстым закручаным хвастом. -- Н-ну! -- прамармытаў нейкі голас. – Драбок ведаў, лёгенькі, нібы валасок, у цябе ўжо ёсьць. Савянятка пачало круціць галавою ва ўсе бакі. -- Я буду вучыцца. – пырхнула яно й тут жа заснула.**



**Як толькі пачало займацца на дзень і ранішняе сьвятло пацяло лістоту, Савянятка прачнулася й было ўсьцешанае, бачачы ружовы водбліск зары. -- Што ж я знайду, пра што даведаюся сёньня? -- запыталася яно. Савянятка распрастала свае крылы й бясшумна ды ймкліва паляцела над ранішнім лесам у бок Летуценных гор. Яно ўбачыла, як унізе пеніўся й зіхцеў пералівамі ручай, апусьцілася ніжэй і заўважыла чалавечую хаціну, пра якую яму распавядаў Лясны Кот. Наўкола ўсё было ціха, калі не лічыць квохканьня адной ці дзвюх Курак, што корпаліся побач, шукаючы чарвякоў. Але ніжэй, там, дзе цёк ручай, было чутно, як сьпяваў чалавечы голас. Савянятка паляцела на гэты голас і ўбачыла Жанчыну, якая набірала ваду.**



**Савянятка спусьцілася на ягадны куст і хрыплаватым галаском прагаварыла: -- У цябе прыгожы голас – куды прыгажэйшы ад майго.**

Жанчына падняла галаву й засьмяялася. Пасьля яна сказала Савянятку:
-- Уяві сабе: калі б ва ўсіх істотаў былі аднолькавыя якасьці, дык хіба ж бы на сьвеце не было сумна? Да прыкладу, ты бачыш і чуеш лепей за мяне; я ўжо не кажу пра тое, што ты ўмееш лятаць. -- А чаму ты сьпяваеш? -- запыталася Савянятка. – Можа, ты, як той Дрозд, бароніш межы абшару, дзе харчуешся? -- Я сьпяваю, каб лягчэй ішла праца, -- адказала Жанчына. – А бывае, што я пяю ў гонар Вялікай-Маці-Стваральніцы-Ўсяго.
-- А дзе яна жыве? -- спытала Савянятка. -- Усюды, -- адказала Жанчына. -- Людзкое вока яе згледзець ня можа. Сонца, месяц і зоры – гэта толькі аздоба на яе ўбраньні. -- А калі я табе скажу, -- прашаптала Савянятка, -- што Рыбы ў гэтым ручаі ведаюць пра Вялікую-Рыбу-Стваральніцу-Ўсяго?
-- Вядома, Вялікая-Маці праз гэта не пакрыўдзіцца, -- адказала Жанчына, -- бо я прашу ў яе шмат чаго...
Вось жа, каб страха на маёй хаціне пратрывала як найдаўжэй, каб мае Куркі выводзілі шмат Куранятаў і каб мы былі заўсёды здаровыя – маё дзіця ды я... -- Ты клапоцішся пра тое, што будзе заўтра? -- Пра гэта клапоціцца, відаць, кожны, -- прамовіла Жанчына. – А ты ня ведаеш, ці будзе сёньня дождж? Я б хацела, каб мая бялізна пасьпела высахнуць.
-- У паветры дажджом ня пахне, -- адказала Савянятка, потым прастракатала нешта на разьвітаньне і паляцела ўгору, уздоўж ручая.



Сонца сьвяціла цэлы дзень, і Савянятка цешылася гэтым шчодрым сьвятлом. Пры гэтым яно магло ўсё-ўсё яшчэ раз добра абдумаць. Увечары яно даляцела да схілаў Летуценных гор. Калі надышла ноч, Савянятка ўбачыла, як сярод дрэваў нешта зьзяе, нібы залатая зорка. Яно паляцела на гэтае сьвятло й неўзабаве ўбачыла маленькую драўляную хатку. Сьвятло выбівалася зь яе праз адтуліну ў сьцяне й вабіла да сябе Начных Матылькоў. Савянятка таксама адчувала сябе нібы прычараваным гэтым сьвятлом. Яно сьмялей і сьмялей набліжалася да хаткі, аж пакуль не апынулася на вузенькай сьцежцы перад самаю адтулінаю. Савянятку надта спадабалася цеплыня, што йшла ад гэтага сьвятла, й яно пачало напяваць

**Савінуюю Песьню Любові. Яно павухквала, падвывала й пахрыпвала. -- Сава на маім падваконьні, -- прамовіў нізкі голас, -- шчыра цябе вітаю! Савянятка прымружыла вейкі, каб па-за моцным сьвятлом разгледзець таго, хто гаварыў. Гэта быў Стары Чалавек.**



**Савянятка запыталася ў Старога Чалавека: -- Што ты тут робіш?**
**-- Чытаю, -- адказаў Стары Чалавек і лёгкім рухам з дапамогаю белага аркуша паперы адагнаў ад сябе Матылькоў. -- Мне не хапіла дня, й вось я чытаю пры сьвятле маёй лямпы. Гэтая кніга -- пра Вялікага-Бацьку-Стваральніка-Ўсяго. -- А дзе ён жыве? -- спытала Савянятка.**
**-- Усюды, -- адказаў Стары Чалавек. – У Нябесным царстве, якое ня могуць убачыць мае вочы, і ў сэрцах людзей. -- Ты просіш у яго на заўтрашні дзень? -- зноў спытала Савянятка. -- Вядома, -- адказаў Стары Чалавек, -- але яшчэ болей я прашу ў яго на час мінулы. У маім жыцьці было гэтулькі такога, што не магло стрываць перад ягонымі вачыма. Гэта моцна мяне займае. -- А калі я табе распавяду, -- прашаптала Савянятка, -- што Начныя Матылькі ведаюць пра Вялікага-Матыля-Стваральніка-Ўсяго...**
**Стары чалавек са спачуваньнем заўсьміхаўся. -- Як бы яны маглі сабе йначай уявіць Старога-Бацьку? -- Мажліва, як тую Старую-Маці, пра якую казала Жанчына там, куды цячэ ручай?**
**Стары Чалавек зморшчыў лоб.**

**-- Ёй я ўжо вельмі шмат распавядаў пра Старога-Бацьку, але, напэўна, пакуль што марна, як гэта відаць з тваёй заўвагі. Але я ма́ю надзею, што некалі яна спазнае Ісьціну. -- Хіба Вялікі-Бацька будзе абражаны, калі тая Жанчына назаве яго Вялікай-Маці? -- спытала Савянятка. Стары Чалавек надоўга задумаўся. -- Што за дзіўнае пытаньне... Мяркую, што ня будзе. Вялікі-Бацька зычлівы й добры. Хутчэй, гэта я, ягоны адданы служка, адчуваю сябе абражаным... -- Не бяры гэта моцна да галавы, -- прамовіла Савянятка, шапятнула на разьвітаньне й паляцела прэч.**



**Назаўтра раніцою Савянятка паляцела назад да ручая. Гэтым разам Жанчыны там не было, затое яна ўбачыла Дзіця. Яно сядзела на беразе, трымаючы на каленях Котку, боўтала нагамі ў вадзе й назірала за рыбкамі. Сонца асьвятляла Дзіця й Котку, ваду, камяні й траву. Савянятка моўчкі спусьцілася на пянёк. Ягоны востры зрок мог дапільноўваць усё здалёк: тое, як Дзіця песьціла Котку, як Котцы падабалася гэтае пешчаньне – гэтак што яно нават забывалася на рыбак; тое, як зіхцелі-пераліваліся хвалі. Савянятка цешылася з усяго гэтага.**

**...Ці ў Дзіцяці таксама было сваё ймя для таго Дзівоснага, што стварыла ўсё на сьвеце й зрабіла гэтак, што Сонца пачало сьвяціць на небе? Мажліва, Дзіця й ня ведала, як яно называецца, але яно было ў цэнтры ягонае прысутнасьці – гэта Савянятка адчувала вельмі добра. А Заўтра й Пасьлязаўтра яшчэ не надышлі й не былі гэткімі важнымі. А Учора й Пазаўчора былі недзе далёка-далёка ў мінулым і ня мелі аніякае вагі. Савянятка пачало круціць галавою ва ўсе бакі, прыгадваючы ўсе ймёны, што былі дадзеныя таму Дзівоснаму: -- Ты, Вялікая-Сава-Стваральніца-Ўсяго, Вялікі-Лясны-Кот,.. Вялікая-Пава,.. Вялікі-Кажан,.. Вялікая-Мыш,.. Вялікая-Маці,.. Вялікі-Бацька,.. можна было б цябе назваць Вялікай-Заўсёды-Прысутнай-Таямніцай, -- шаптала Савянятка.**
**-- Котка расплюшчыла адно вока й зірнула на Савянятка.**
**-- Чаму ж бы й не, -- прамяўкала яна лянiва.**



**Сонца зайшло, й Савянятка вярнулася ў свой лес. Яно разгледзелася, шукаючы мышынае норкі, а знайшоўшы, пачало гукаць у яе: -- Вух-вух-вух! Усё жывое жывіцца ад жывога! І ў вашых зярнятках ёсьць жыцьцёвая сіла! Пасьля Савянятка паляцела далей і напаткала Кажана. -- Калі б у Кажаніхаў у целе расло больш як адно дзіцянятка, іхнія крылы не ўтрымалі б іх у паветры. -- Мажліва, й гэтак, -- пагадзіўся Кажан.**
**Савянятка праляцела над дрэвам, дзе сьпіць Пава. «Бедная йстота, -- падумала яно сабе, -- гэта ж такая самая птушка, як і куркі, а хоча мець сабе больш як адно дрэва на начлег». Савянятка ляцела далей і напаткала Ляснога Ката, які стаіўся ў засадзе на разлапістай галінцы. Ягоныя вочы заблішчэлі, калі ён угледзеў Савянятка. -- Ну што, цяпер ты паразумнела? -- прапыхкаў Лясны Кот. -- Ня надта, бо я яшчэ малое й толькі вучуся, -- прашаптала задаволена Савянятка. – Дарэчы. я таксама бачыла Котку, якая дазваляла сябе гладзіць. І нават рыбы ў ручаіне не маглі сагнаць яе з каленяў дзіцяці. -- Нечувана! -- прасоп Лясны Кот. -- Калі б усе істоты былі аднолькавыя ды адчувалі адно й тое самае, ці ж гэта не было б сумна? -- запытала Савянятка. – Хіба ж гэта ня добра, што Вялікая-Таямніца, якую ты называеш Вялікім-Лясным-Катом, дапускае шмат мажлівасьцяў? Лясны Кот прамаўчаў, і Савянятка паляцела далей.**



**Урэшце, яно прыляцела да роднага дрэва сваіх Бацькоў. Савяняткавы Бацькі прапыхкалі, вітаючы сваё дзіця: -- Ну што, ці шмат чаму навучылася ты ў Вялікай-Савы-Стваральніцы-Ўсяго?**
**-- Навучылася, – міралюбна адказала Савянятка. – І ад сёньня я буду распавядаць пра гэта вам ды ўсім-усім жывым істотам.**
**-- Рабі, рабі гэтак, маё дзіцятка. – правухкала Сава-маці.**
**А Сава-бацька сказаў: -- Адно толькі сярод людзей табе будзе нялёгка. Бо яны надта мала верацъ каму іншаму. Савянятка пахітала галавою й прамовіла: -- Я буду ляцець гэтак доўга, аж пакуль не знайду таго, хто мне паверыць.**



**КАНЕЦ**